ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 .
6 месяцаў . . . 1 р. 80 .
1 год . . . . 3 р. 30 .
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

№ 29 (997) | АЎТОРАК, 4-га лютага 1930 г.

Цэмэнтаваць колгасы комсамольскімі кадрамі

Колгасны рух сапраўды ахапіў зараз мільёны. Ад дробных, захудалых сялянскіх гаспадарак мы прышлі і ідзем да буйных колгасаў, да раёнаў, акруг і абласьцей суцэльнай колектывізацыі. Але тое, што зараз робіцца ў галіне колектывізацыі, гэта ўсё яшчэ першыя крокі, гэта паводка, калі рэчка ня стала яшчэ ў моцнае і цьвёрдае рэчышча. Усё больш узрастаючае значэньне набывае задача умацаваньня ўноў арганізуемых колгасаў, умацаваньня кожнага колгасу ў паасобку, пераводу колгасу на ўсё вышэйшую і вышэйшую ступень. Гэта задача—задача надзвычайна вялікай важнасьці. Гэта трэба заўсёды падкрэсьліваць, мобілізуючы для вырашэньня гэтай задачы ўсе нашы сілы і сродкі, прыцягваючы да гэтай справы асноўны касьцяк колгасаў—беднату і батрацтва, умела кіруючы масамі серадняцтва, якое ўжо у дастатковай ступені зразумела перавагу колгаснай сыстэмы перад індывідуальнай гаспадаркай, але якое яшчэ ня ведае, не прадстаўляе, як практычна будзе будавацца і працаваць колгас.

Паводка колгаснага руху, ахапляючы асобныя сялянскія гаспадаркі, зьмяце кулакоў. Іменна колектывізацыя дала нам магчымасьць і разам з тым дала нам заданьне—ліквідаваць кулацтва, як клясу. Ліквідацыя кулацтва толькі адзін з бакоў колектывізацыі. Той, хто разумее раскулачваньне як самацёк, адарваную ад суцэльнай колектывізацыі задачу, той, значыцца, незразумеў лініі партыі, незразумеў, што раскулачваньне ў нас павінна зараз праводзіцца толькі ў раёнах суцэльнай колектывізацыі і толькі, як складаная частка суцэльнай колектывізацыі. Стары лёзунг партыі аб абмежаваньні эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва, такім чынам, застаецца ў моцы і зьяўляецца дзейным для раёнаў, якія яшчэ ня прышлі да суцэльнай колектывізацыі.

Раскулачваньне, наогул кажучы справа не цяжкая. Адабраць у кулака сродкі вытворчасьці можна шпарка. Гэтую задачу працоўнае сялянства здолее выканаць параўнаўча шпарка і бяз зацяжак, бо вопыт раскулачваньня ў нас ёсьць.

Але, паўтараем, ня ў гэтым сутнасьць. Сутнасьць у абавязковым спалучэньні раскулачваньня з суцэльнай колектывізацыяй, на базе якой і ў выніку якой павінна праходзіць раскулачваньне.

Комсамол, і асабліва вясковыя яго організацыі, не павярнуўся яшчэ ўсім фронтам да колектывізацыі. Гэта трэба ясна сказаць, каб зразумеўшы гэта шпарчэй перастроіцца для выкананьня вялізарнейшай работы, якая адкрываецца зараз перад намі.

Шмат якія комсамольцы думаюць, што галоўнае зараз агітаваць за колгас, а пагэтаму ўсю сваю ўвагу і ўсе сілы яны кідаюць на такую агітацыю. Організацыя колгасу і агітацыя за яго бязумоўна, —важная справа.

Але гэта яшчэ ня ўсё.—Гэта палова справы, гэта нават чвэртка справы. Бо ў значнай меры масы беднаты і серадвякоў і без такой агітацыі бурна цягнуць да колгасу. Самае важнае наладзіць работу колгасаў, каб колгас працаваў чотка і безперабою, каб ён унутрана быў моцным і не разьядаўся кулацкімі агентамі і самімі кулакамі, каб правільна была організавана праца ў колгасе, каб кожны колгасьнік ясна прадстаўляў свае абавязкі ў колгасе і што колгас дасьць яму. І на гэты бок справы комсамольцы і комсамольскія ячэйкі і павінны зараз зьвярнуць асаблівую ўвагу. Гэта патрабуе таго, каб у раёнах суцэльнай колектывізацыі сельскія комсамольскія ячэйкі сталі колгаснымі ячэйкамі. Зараз гэтага яшчэ няма. Зараз бывае так, што сельскія ячэйкі зусім ня цікавяцца справамі колгасу, ня ўдзельнічаюць у колгасным будаўніцтве. Нават больш таго — самі комсамольцы не ўваходзяць у колгас, працягваючы весьці сваю індывідуальную гаспадарку.

У шэрагу раёнаў, напрыклад, на Сярэдняй Волзе, нядаўна было такое становішча, што з сялянскіх гаспадарак ў колгасах было 80 проц., а з комсамольскіх—усяго толькі 20 проц. У іншых мясцох некалькі лепш, але усё-ж нідзе яшчэ мы не дабіліся такога становішча, каб усе комсамольцы уваходзілі ў колгас.

Партыя дала лёзунг: Усе вясковыя комуністы і комсамольцы—у колгасы! Трэба з усёй напружанасьцю і энэргіяй узяцца за правядзеньне гэтага лёзунгу у жыцьцё, выкрыць і ускрыць жорсткім агнём самакрытыкі опортуністых на практыцы, якія не уваходзяць у колгасы. Агітацыя справавае—самая лепшая угітацыя. Уваходзячы у колгасы комуністы і комсамольцы будуць іх моцна цэмэнтаваць, аб'ядноўваючы беднату і батрацтва, кіруючы серадняцкім сялянствам, якое стала на новы шлях гаспадараньня.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі абавязаны стаць на чале мас, якія перабудоўваюць сельскую гаспадарку на соцыялістычных пачатках. Зараз уся работа комсамольскіх ячэек у раёнах суцэльнай колектывізацыі павінна быць перабудавана на баявы лад, яшчэ больш высокі па тэмпу, чымся у месяцы хлебазагатовах.

Колектывізацыя, раскулачваньне, вясеньняя сяўба высоўваюць вялікую колькасьць пытаньняў, на якія трэба даць ясныя і вычэрпаючыя адказы. Тая ячэйка, якая не дасьць гэтых адказаў, ня зможа стаць на чале мас, яна будзе плесьціся ў хвасьце вялізарнай творчай работы.

Тэмпы ячэйковай работы павінны быць у шмат раз узмоцнены Самі ячэйкі павінны вырасьці за лік бядняцкай і батрацкай моладзі. Вакол ячэйкі трэба скалаціць шырокі і моцны касьцяк актывістых, у тым ліку і актывістых з колгаскай серадняцкай моладзі.

Усе сілы ячэйкі, усе сілы моладзі якая ідзе за комсамолам кінем на колгаснае будаўніцтва, на організацыю унутры колгаснага вытворчага жыцьця, на раскулачваньне, на вясеньню пасяўную кампанію!

Гэтая вясна будзе для усіх нашых вясковых ячэек вялікім экзаменам на палітычную сьпеласьць. І гэты экзамен павінен быць вытрыманы! без хістаньняў, без суматохі. Без спазьненьняў рэалізуем тыя вялізарныя заданьні, якія зараз пастаўлены партыяй!

Барацьба гамбурскіх пролетараў абвастраецца

БЭРЛІН, 3. У знак протэсту супроць тэрору паліцыі ў Гамбурзе спынілі працу рабочыя 30 буйных будаўніцтваў. На некаторых мэталёвых прадпрыемствах таксама абвешчана 24-хгадзінная забастоўка протэсту. У гамбурскім порце пад адкрытым небам адбыліся мітынгі партавых рабочых. Паведамленьне аб тым, што гамбурскі орган компартыі забаронен паліцыяй, выклікала абурэньне. Тысячы рабочых наваднілі вуліцы па дарозе да порту.

Комсамольскія дэмонстрацыі ў Празе

ПРАГА, 3. У розных раёнах Прагі адбыліся комсамольскія дэмонстрацыі пад лёзунгам барацьбы з ваеннай небясьпекай і за абарону СССР. Паліцыя ўсюды нападала на дэмонстрантаў, затрымаўшы 10 чалавек. Двое з іх пакінуты пад вартаю, 6 аштрафавана і супроць двух паліцыя ўзьнімае судовыя прасьледваньні.

„Сусьветная рэволюцыя набліжаецца“

Выступленьне т. Дорыё

ПАРЫЖ, 2. У палаце депутатаў скончыліся спрэчкі па бюджэту міністэрства калёній.

Вялікая прамова камуністычнага дэпутата Дорыё, з якой ён выступіў гэтымі днямі аб становішчы у Індакітаі (у гэтай прамове Дорыё выкрыў ролю соцыялістых у калёніяльнай эксплёатацыі) літаральна ўзвар'явала соцыялістых.

Сыкст Кенэн, які выступіў ад імя соцыялістычнай партыі, востра нападаў на камуністых і заявіў, што комуністы, „вырашыўшы пачаць сусьветную рэволюцыю у калёніях,—гэтым падрываюць самую аснову магутнасьці нашай краіны“.

Далей Сыкст Кенэн завяраў буржуазную частку палаты, што „у адрозьненьне ад комуністых соцыялісты зусім не дамагаюцца вываду француcкага войску з калёній, прызнаючы абарону францускіх грамадзян, якія знаходзяцца у калёніях, сьвятым абавязкам“.

Перад сканчэньнем спрэчак з адказам на ганебны паклёп соцыялістых выступіў Дорыё.

Соцыялісты,—кажа т. Дорыё,—адхіляюць уздым міжнароднага рабочага руху. Тры буйных падзеі падцьвярджаюць, што мы маем на гэта поўную рацыю, гэтыя падзеі—Кастрычнікавая рэволюцыя і пераможнае соцыялістычнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, магутныя клясавыя бойкі, якія разгортваюцца ў сучасны момант ва ўсіх капіталістычных краінах і ўздым рэволюцыйнага руху ў калёніях. Наяўнасьць гэтых трох фактаў, хочаце вы таго, ці не, набліжае сусьветную рэволюцыю.

Пад шалёны вой на соцыялістычных лаўках Дорыё кідае соцыялістым словы, сказаныя калісьці Гэдам: „Вы любіце пролетарыят такім, як некаторыя любяць бэфштэкс, г. зн. акрываўленым“.

Слаўнаму юбіляру АБВШ імя ЦВК БССР

Прывітаньне ЦК ЛКСМБ

У дзень 9-й гадавіны ЦК ЛКСМБ ад імя Комсамолу Беларусі пасылае сваё шчырае комсамольскае прывітаньне чырвонаармейцам курсантам і начполітскладу школы.

Гісторыя барацьбы Чырвонай арміі і комсамолу за дыктатуру пролетарыяту шчыльна зьвязана у адно цэлае. У гады грамадзянскай бойкі комсамол аддаваў лепшых таварышоў у шэрагі Чырвонай арміі на перадавыя пазіцыі

Комсамол пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі даў рашучы адпор контр-рэволюцыйнай опазыцыі троцкістых і вядзе ўпартую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго.

Ленінскі комсамол дапамагае партыі ў хутчэйшай перабудове краіны на соцыялістычны лад, зьяўляючыся ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва ударніцкага руху на усіх фронтах гаспадарчага будаўніцтва

Сьвята 9-й гадавіны АБВШ—ёсьць сьвята усяго комсамолу Беларусі.

Цэнтральны Камітэт завярае АБВШ, што і надалей ленінскі комсамол будзе пасылаць лепшых комсамольцаў на укамплектаваньне школы, больш аддасьць увагі на вайсковую вучобу і баявую падрыхтоўку усяго комсамолу і працоўнай моладзі.

ЦК ЛКСМБ.

Весткі з Францыі

Нячувана наглая кампанія паклёпу і правакацыі супроць СССР

Бульварны і белагвардзейскі друк стварае атмасфэру ганебнай правакацыі ў адносінах да паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР

ПАРЫЖ, 2. Газэты паведамляюць, што крымінальная паліцыя праводзіць энэргічнае дазнаньне і пошукі зьнікшага Куцэпава. Бульварны і белагвардзейскі друк стварае атмосфэру ганебнай провакацыі ў адносінах да поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР.

Вядомая сваёй блізкасьцю да паліцыі газэта „Лібэртэ“ лічыць устаноўленай кражу Куцэпава парыскім аддзяленьнем ДПУ. Самым ганебным чынам намякаючы, аб нібы-та чутых у памяшканьні паўнамоцнага прадстаўніцтва крыках, нейкай „падземнай рабоце ў садзе паўнамоцнага прадстаўніцтва“, газэта патрабуе неадкладнага вобыску паўнамоцнага прадстаўніцтва. „Віктуар“ патрабуе вобыску і разрыву франка-савецкіх адносін.

„Волонтэ“ піша ў перадавіцы, што гэтай скандальнай кампаніі трэба пакласьці канец. „Парывуар“ зазначае на недапушчальнасьць цкаваньня, якое распальваецца белагвардзейцамі вакол паўнамоцнага прадстаўніцтва.

„Юманітэ“ у перадавой зварачвае ўвагу францускіх рабочых мас на нячувана-наглую кампанію паклёпу і правакацыю супроць СССР пад прыкрыцьцём зьнікненьня Куцэпава. „Урад Тардзе і Брыяна,—піша газэта,—ня толькі церпіць гэтае цкаваньне, але па сутнасьці нават натхняе яго усёй сваёй політыкай“.

Тав. Даўгалеўскі у міністэрстве замежных спраў

ПАРЫЖ, 2. Паўнамоцны прадстаўнік тав. Даўгалеўскі наведаў генэральнага сэкратара францускага міністэрства замежных спраў Бэртэля і зрабіў яму сур'ёзнае папярэджаньне у сувязі з наглай кампаніяй францускага рэакцыйнага расійскага белага друку супроць савецкага ураду і паўнамоцнага прадстаўніцтва. Тав. Даўгалеўскі даводзіў, што белагвардзейцы адкрыта падрыхтоўваюць гвалтоўныя дзеяньні супроць паўнамоцнага прадстаўніка з мэтай правакаваньня сур'ёзнага конфлікту паміж СССР і Францыяй.

Тав. Даўгалеўскі зазначыў на неабходнасьць ужыць неадкладныя захады да абароны савецкага ўраду і паўнамоцнага прадстаўніцтва ад бесцэрамонных выпадаў і провакацыйных актаў белагвардзейцаў, усклаўшы адказнасьць за вынік няўжыцьця захадаў на францускі урад.

Перад наборам у вайсковыя школы

ПАДРЫХТУЕМ ПРОЛЕТАРСКІЯ КАДРЫ ДЛЯ ВАЙСКОВЫХ ШКОЛ

ЗАРАЗ-ЖА ТРЭБА РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ Ў ВАЙСКОВЫХ ГУРТКОХ, ШЧЫЛЬНЕЙ ЗЬВЯЗАЦЦА З ПАДШЭФНЫМІ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІМІ ЧАСТКАМІ

Датэрмінова пачаць вярбоўку

Хутка пачнецца набор у вайсковыя школы. Для нашых школ патрэбны клясава падыходзячыя людзі. Пры гэтым наборы нам нельга паўтараць тыя памылкі, якія былі дапушчаны ў мінулых наборах. Нам трэба выканаць, нават перавысіць пастановы пленуму ЦК КП(б)Б аб забесьпячэньні 65 проц. рабочых у вайсковых школах. Гэтую пастанову трэба перавысіць. Комсамольскія ячэйкі фабрык і заводаў павінны шырока разгарнуць растлумачальную працу сярод сваіх комсамольцаў і беспартыйнай моладзі па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы. Трэба разгарнуць работу гурткоў ТДА-Авіяхіму, каб комсамольцы, якія ідуць у вайсковыя школы, мелі адпаведную практычную вайсковую падрыхтоўку. Трэба шчыльней зьвязацца з падшэфнымі вайсковымі часткамі.

Комсамольскія ячэйкі вёсак таксама павінны вербаваць з сваіх шэрагаў у вайсковыя школы батрацкую, бядняцкую і серадняцкую моладзь. Комсамол павінен быць першым ініцыятарам і ў гэтай галіне. Трэба да гэтага пытаньня прыцягнуць усю грамадзкасьць, каб мы былі забясьпечаны добрымі выхавацелямі і байцамі нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Алёшка.

ПАЧАЛАСЯ ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ ВАЙСКОВА-ПОЛІТЫЧНАЕ ВУЧОБЫ

Першая ступень вайскова-політычнае вучобы з маладымі чырвонаармейцамі другога артпалка пачалася. Гэты пэрыод зьяўляецца асноўным у вайскова політычвай вучобе, ад яго будзе залежаць уся наступная вучоба. Першы пэрыод вучобы характэрны вывучэньнем і наогул азнаямленьнем з чырвонаармейскім жыцьцём. У галіне політычнай падрыхтоўкі трэба дабіцца ўвязкі з пытаньнямі бягучай політыкі, галоўным чынам зьвязваючы з вывучэньнем лістападаўскага пленуму УсеКП(б).

У тактычнай падрыхтоўцы байцам даюцца простыя навыкі паходнага руху і наогул звычкі, як карыстацца зброяй і берагчы яе.

Чырвоны.

Павысіць вайсковую кваліфікацыю

У летні час бюро і група комсамолу 39 кавпалка ўдзялялі вялікую ўвагу пытаньню баявой падрыхтоўкі. Гэтае пытаньне абгаварвалася на пасяджэньнях прэзыдыумаў груп. На сходах груп комсамолу заслухваліся даклады камандзіраў эскадрону, політкіраўнікоў і групаводаў.

Але цяпер работа значна паслабла. Пачатак зімовай вучобы быў прапрацаваны толькі ў адной групе 3 эскадрону.

Побач з гэтым, трэба адзначыць посьпехі ў адносінах прыкладных паводзін комсамольцаў, як на страявых, так і на політычных занятках. У першым эскадроне па ініцыятыве комсамольцаў праводзяцца гутаркі па статутах і іншых пытаньнях вучобы.

Трэба зазначыць, ш апоргі недастаткова цікавяцца вучотам пасьпяховасьці комсамольцаў у вучобе, і поўнасьцю ня ведаюць падрыхтоўкі комсамольцаў па ўсіх відах вучобы.

Камісія па праверцы вучобы зазначыла на неабходнасьць для комсамольскай організацыі палка быць заўсягды ў курсе вайсковай вучобы і навучальных задач сваёй часткі, таксама на наладжаньне сыстэматычнай работы па аказаньні дапамогі комсамольцам у справе павышэньня вайсковай кваліфікацыі. Таксама трэба аказаць дапамогу адстаючым комсамольцам і беспартыйным, шляхам організацыі груп па самападрыхтоўцы.

Фрунзавец.

МАСТАЦТВА—НА СЛУЖБУ СОЦ. БУДАУНІЦТВУ

Музычныя ўстановы ўсё яшчэ не падначалілі зьмест сваей работы задачам соц. будаўніцтва. Частка ўстаноў засьмечана социяльна-чужым элемэнтам

СЛАБАЯ ПАДРЫХТОЎКА ПРОЛЕТАРСКІХ МУЗЫЧНЫХ КАДРАЎ

ИКА, профсаюзы і комсамольскія організацыі павінны неадкладна заняцца гэтай справай

Адным з галоўнейшых пытаньняў нашай працы на культурным фронце зьяўляецца замацаваньне позыцый пролетарыяту ва ўсіх галінах навуковай і мастацкай працы. Мастацтва, якое да рэволюцыі было багацьцем невялічкай кучкі капіталістых і абшарнікаў, было незядомым шырокім колам працоўных. Зараз, у большай ступені чымся калі перад намі стаіць пытаньне гегемоніі пролетарыяту і на фронце мастацтва. У гэтым артыкуле мы маем на ўвазе толькі адну галіну мастацтва - музыку.

Вялікі тэмп нашага гаспадарчага будаўніцтва значна павялічвае культурныя запатрабаваньні працоўных мас. Музыка—вялікі сродак уплыву на масы, музыка, акрамя таго, зьяўляецца сродкам культурнага адпачынку, яднае волю мас ва кол ажыцьцяўленьня пастаўленых перад намі задач. Гэтую моцную зброю пролетарыят павінен скарыстаць у мэтах найхутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё нашых пляна͡ў. вялікіх плянаў будаўніцтва новага жыцьця—соцыялізму.

Культурная рэволюцыя, якая прадугледжвае поўную замену царквы касьцё..у, сінагогі і піўной на тэатры, рабочыя клюбы, хаты-чытальні і кіно, патрабуе надзвычайна-вялікага тэмпу і чоткай лініі ў галіне разьвіцьця паасобных відаў нашага мастацва, у тым ліку і музыкі.

Ва ўмовах Савецкай Беларусі, якая не атрымала ў спадчыну аніякай культуры (асабліва ў галіне музычнай) гэтае пытаньне набывае яшчэ большае значэньне.

Нацыянал-шовінізм розных колераў, які праявіў сябе ў галіне беларускай літаратуры (М. Зарэцкі, Ц. Гартны і інш.), знаходзіць сабе добрае рэха, водгульле сярод музычных дзеячоў. Справа ў тым, што клясавага ворага ў музыцы значна цяжэй распазнаць, чымся ў літаратуры, але ёсьць галіна музычнага мастацтва, дзе слова і музыка дапаўняюць адно-другое,—гэта музыка вокальная. Што-ж робіцца ў нас на Беларусі ў галіне вокальнага мастацтва?

Вялікая колькасьць прыгожых беларускіх народных сьпеваў сабрана рознымі музычнымі дзеячамі. Гэтыя песьні зьяўляюцца вельмі каштоўнымі, як з боку музычнага (мэлёды, рытмікі, дынамікі) таксама з боку літаратурнага.

Гэта народная творчасьць можа быць добрай асновай—грунтам дзеля стварэньня новай беларускай пролетарскай музыкі толькі ў тым выпадку, калі гэтыя песьні ня прымаць, як кажуць, „на веру", а кожную з іх прапусьціць праз наша густое пролетарскае сіта.

Вялікая колькасьць сабраных народных сьпеваў недзе ляжыць (як ляжала і тры чатыры гады таму назад) пад сукном бюрократаў—музыкаў, а таму нашы клюбныя сцэны, школы сямігодкі засьмечаны такімі песьнямі, ад якіх даўно ўжо час адмовіцца. Вось некалькі прыкладаў.

У нашых школах дзеці сьпяваюць:

Саўка, ды Грышка
Лалзілі дуду,
Ладзілі славіць
Дудой каляду.

альбо нашы хоры ў рабочых клюбах расьпяваюць:

Ой маці сына,
Ды спарадзіла...

і далей:

Дзьве бярозанькі
Цераз цэркаўку
Цераз цэркаўку
Сашчапіліся і г. д.

Гэта—у самы разгар анты-рэлігійнай кампаніі, у той час калі мы крычым: Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыялізм.

Паглядзім, што выпускае Дзяржаўнае Выдавецтва. У 1924-25 г. вышаў з друку зборнік беларускіх сьпеваў М. МАЦІСОНА (выд. муз. сэктару Госиздату). у ім мы знаходзім такія „пэрлы" як „Вяцкі марш", напісаны ў гонар вайсковай рады белапалякаў у часе іх прабываньня на Беларусі, на словы нейкага ксяндза. Аўтары гэтага зборніка абмежаваліся тым, што зьмянілі словы: „І наш сьцяг чырвона-белы" на словы: „Свободы сьцяг, штандар чырвоны". і лічаць, што ўсё ў належным парадку. У гэтай-жа песьні далей мы сустракаем: „Хай скіне ўсюды ўсе прапоны наш беларускі родны дух", што гэта за такі „дух", відаць без усялякіх комэнтарыяў.

У гэтым-жа сьпеўніку ёсьць песьня „Беларуская зямліца", у нашых школах дзеці ў якасьці прыпеву сьпяваюць:

Беларусь люблю я,
Для яе працую
Покуль хопіць сілы
Да самай магілы.

Аб якой Беларусі ідзе тут справа, аб дарэволюцыйнай, ці Савецкай і чаму наогул толькі аб Беларусі,—не зразумела.

З прыведзеных некалькіх прыкладаў яскрава відаць, што ў музычным выхаваньні працоўных Беларусі маюцца вялікія прабелы і недахопы Мімаволі паўстае пытаньне: куды падзеліся народныя беларускія сьпевы, тысячамі запісаныя ў розных кутках? Кім яны марынуюцца?



І ТАКІЯ часам трапляюцца!..

Чуждыя элемэнты кіруюць песеннай камісіяй

Гэтыя песьні ляжалі раней пад сукном песеннай камісіі Інбелкульту, а зараз ляжаць у песеннай камісіі Акадэміі Навук. Справа ў тым, што гэта камісія складалася ў большасьці з асоб, якія ня маюць нічога супольнага з нашым соцыялістычным будаўніцтвам, альбо асоб анты-савецкі настроеных.

Вось прыкладныя „члены" песеннай камісіі: 1. Праф. Прохараў нядаўна выключаны з ліку настаўнікаў Менскага Музычнага Тэхнікуму за антысэмітызм і антысавецкія паводзіны; Чарнякоўскі—дамаўласьнік, зараз на вялікі жаль працуе ў сэмігодка у якасьці настаўніка сьпеваў. Той Чарнякоўскі, які адмовіўся падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і, калі вучні яго папрасілі падпісаца на пазыку, ён адказаў: Что это вы—нищие, что я буду вам отдалживать?".

Зараз у гэтай камісіі справа абстаіць ня лепш. Адным з галоўных заправіл яе (які дзеля гэтага і запрошаны ў Менск у якасьці „імпорту") зьяўляецца Анцаў—былы рэдактар контр-рэволюцыйных Ведамасьцей, чалавек антыграмадзка настроены і цэлы шэраг іншых асоб, бяручых свой пачатак ад рэгенцтва царкоўнымі і касьцёльнымі хорамі і другіх падобных месц.

Бязумоўна, што пры такім складзе „работнічкаў", справу ўперад не пасунеш і соцыялістычных тэмпаў разьвіцьця музычнага мастацтва не дачакаешся. Ня можна думаць таксама і аб тым, што гэта камісія зробіць патрэбны нам соцыяльны адбор народнай песьні.

Затое гэтыя „пролетарскія ідэолёгі" красамоўна агітуюць супроць беларускай песьні, кажучы: „Беларуская народная песьня аджывае свой век, яна памірае, бо яна створана ў часе прыгону, ад яе нясе потам, лапцем і сьлязамі і г. д.". Гэтыя „ідэолёгі" пахавалі народную песьню перш чымся яна фактычна нарадзілася. (гармонізаваная песьня). Яны замазваюць рэволюцыонізуючую ролю народнай песьні.

Ня лепш абстаіць справа і з песьнямі іншых нацменшасьцяй—яўрэйскімі і польскімі.

Што датычыцца рэволюцыйнай музычнай беларускай літаратуры справа абстаіць таксама дрэнна. За 1929 год Бел. Дз. Выдавецтва выпушчана яе ўсяго на 15 кап. („Ліпнёвы гімн", муз. Равенскага, на словы Дубоўкі).

Усё гэта сьведчыць аб тым, што няма дастатковага пролетарскага кантролю ў гэтай важнай справе. Так надалей заставацца ня можа. Трэба гэту галіну нашай працы аздаравіць за кошт новых пролетарскіх кадраў, а таксама прыцягнуць да гэтай справы ўвагу савецкай грамадзкасьці, каб яна ня была толькі „кабинетнай" справай камісіі.

У музычнай справе патрэбен рашучы пералом

У сучасны момант, калі пытаньне аб кадрах. тым больш мастацкіх пролетарскіх кадрах, стаіць так востра, трэба плян навучаньня, які яшчэ да гэтага часу па „цьвёрдакаменнасьці" музычных заправіл толькі будуецца, „як калісьці ў нас у консэрваторыі", пабудаваць такім чынам, каб як-мага ў меншы тэрмін можна было выпусьціць музыку, на першы час хоць сабе вузкага спэца—трубача, скрыпача, сьпевака і г. д.

На самай справе навучальны плян непрыстасаваны да запатрабаваньняў працоўных, бо мы ня можам дапусьціць такога зьявішча, калі навучаньне ў музычна-асьветных установ цягнецца 12—15 год.

Беларусь мае: Дзяржаўны Музычны Тэхнікум у Менску, у Віцебску, некалькі музычных школ—у Менску, Магілеве, Гомелі. Музычныя школы знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, што вымагае ад вучняў музычных школ досыць высокае платы за права навучаньня. Зразумела, што ні рабочы, ні бедняцкае сялянства ня можа паступіць вучыцца ў гэтыя школы. У музтэхнікум рабочую моладзь прымаюць з пэўнай падрыхтоўкай, без яе прыём вытвараецца „як выключэньне", і часта бываюць такія выпадкі, калі гэтых таварышоў пасьля двух-трох год навучаньня выключаюць за непасьпяховасьць, ужо відаць „без выключэньня".

Трэба адчыніць дзьверы музычных школ і тэхнікумаў для працоўнай моладзі, памятуючы, што барацьба за пролетарскія мастацкія кадры—барацьба за пролетарскае мастацтва, за культуру соцыялізму.

З гэтага яскрава відаць, што ў музычнай справе на Беларусі трэба зрабіць нейкі пералом.

На старых клясыках „выхоўваецца" моладзь у музычных установах

Наша моладзь вучыцца на старых клясыках. Сярод твораў гэтых клясыкаў мы сустракаем пераважную колькасьць рэчаў, якія па свайму зьместу і па эмоцыянальнай зарадцы, якую атрымоўвае слухач пасьля яе выкананьня, чужыя, альбо нават шкодныя. Наша моладзь прымае рэчы старых композытараў за „чыстую манэту", бо яны ім падаюцца настаўнікамі бяз усялякай крытыкі. Неабходна ўсё тое, што даецца студэнту ў якасьці заданьняў, падносіць ў марксысцкім асьвятленьні, стлумачыць яму клясавую сутнасьць рэчы.

Нашы кадры, якім прыдзецца насіць мастацтва ў масы, выконваць наш лёзунг МАСТАЦТВА ПРАЦОЎНЫМ, павінны, у першую чаргу, САМІ добра ведаць соцыяльныя карэньні паходжаньня музыкі і яе соцыяльна-клясавы зьмест. МУЗЫКА НЯ ТОЛЬКІ ДЛЯ АСАЛОДЫ, МУЗЫКА ПАВІННА СЛУЖЫЦЬ СПРАВЕ ПРОЛЕТАРЫЯТУ, СПРАВЕ НАЙХУТЧЭЙШАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ, ПАСТАЎЛЕНЫХ ПЕРАД ПРОЛЕТАРЫЯТАМ ЗАДАЧ.

„Анблема пичали"

На Беларусі расьце вялікая колькасьць музычных харавых гурткоў, але працуюць яны амаль без усялякай консультацыі—„без руля і без ветрыл".

Вялікі колгасны рух, які разгарнуўся ў нас на Беларусі, патрабуе пераломý ў мастацкай працы вёсцы. Калі да гэтага часу ў вёску не накіроўваліся мастацкія працаўнікі, бо там ня было належнай базы для працы, дык зараз перад намі гэта пытаньне стаіць ва ўсю шырыню. У буйных колгасах можна і неабходна організаваць хоры, оркестры, драмгурткі, трэба вёску пазнаёміць з новымі комсамольскімі, чырвонаармейскімі, сьпевамі. Вёска ня ведае добрых сьпеваў (акрамя народных). Сялянская моладзь расьпявае:

„Чорные розы –
Анблема пичали..."

і другую падобную бязглузьдзіцу. У вёску, у буйнейшыя колгасы трэба накіраваць добрых інструктароў-музыкаў.

Як абстаіць концэртная справа ў горадзе? Возьмем хаця-б Менск. Часам сцэны рабочых клюбаў засьмечваюцца халтурай, праўда, апошні час профэсыйныя організацыі і Галоўліт моцна ўзяліся за праверку рэпэртуару артыстых, і зараз яшчэ нейкім шляхам варожы нам рэпэртуар прабіраецца нават на сцэну Дзяржаўнага Тэатру, як, напрыклад, абураючы выпадак з ДНЯПРОВЫМ І МІЛІЧ. Пасрэдмастацтва пасылае на працу артыстых у рабочыя клюбы па вельмі высокай цане—20-25 руб. за 15 хвілін працы. Трэба ў гэтую справу ўнесьці сьвежы струмень. Сярод працаўнікоў мастацтва няма ўдарных груп па абслугоўваньню рабочых клюбаў. Трэба стварыць грамадзкую думку, узьняць увагу шырокіх колаў працоўных вакол гэтых пытаньняў і, у першую чаргу, аб гэтым павінна паклапаціцца таварыства „Музыка—масам".

У гэтым артыкуле мы закранулі толькі адмоўныя бакі. Есьць і цэлы шэраг дасягненьняў.

УСЁ СКАЗАНАЕ Ў ГЭТЫМ АРТЫКУЛЕ ПРЫМУШАЕ НАС БІЦЬ ТРЫВОГУ, ШТО НА ГЭТЫМ ФРОНЦЕ НЯ ЎСЁ ДОБРА.

ДАЙЦЕ НАМ НОВЫЯ МАСТАЦКІЯ КІРУЮЧЫЯ ПРОЛЕТАРСКІЯ КАДРЫ, А ТО НЕКАТОРЫЯ НАШЫ СУЧАСНЫЯ „КІРАЎНІКІ" ЗА ЦАРКОЎНЫМ ЛАДАНАМ НЯ БАЧАЦЬ ФАБРЫЧНАГА ДЫМУ.

ЛЮБАН

Аб парушэньнях самакрытыкі ў пастановах Гомельскай АКК КП(б)Б

(СПРАВЫ РАБКОРАЎ СЬПІРТАЗАВОДУ: ДУБАВА, МАРКАВА, КРЫШТАФУНА, ЗАІКІ, ГАЎРЫЛАВА; ЗАЛІНЕЙНАГА І РЭЧЫЦКАГА РАЁНАЎ І ІНШ.)

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне камісіі ЦКК па абсьледваньні Гомельскай АКК аб радзе грубых парушэньняў самакрытыкі ў пастановах АКК РСІ, якія выразіліся ў тым, што:

а) пры разглядзе ў прэзыдыуме АКК вывадаў камісіі па расьсьледваньні колектыўнай заметкі групы рабочых—членаў партыі ячэйкі сьпіртазаводу аб недахопах на заводзе,—прэзыдыум неўгрунтавана вынес суровае спагнаньне падаўшым заяву, не асудзіўшы паводзін камісіі АКК і бюро Нова-Беліцкага РК, якія правялі пастанову аб выключэньні іх з партыі, нібыта за групоўку і процістаўленьне сябе бюро ячэйкі, праявіўшы гэтым зусім някрытычныя адносіны да абмяркоўваемага пытаньня;

б) пры разглядзе заявы рабкораў Залінейнага раёну яшчэ ў пачатку году АКК РСІ, ня гледзячы на наяўнасьць момантаў, якія сыгналізуюць зьявішча заціску самакрытыкі, прыняла пастанову, якая фактычна змазала пытаньне, што ў далейшым пры расьсьледваньні гэтае справы зноў камісіяй АК і АКК было прызнана ў пастанове бюро АК і прэзыдыуму АКК;

в) у справе аб ганеньні на рабкора Крыштафука („Рухавік Рэвалюцыі") АКК дапусьціла цяганіну і няпрыняцьце сваечасовых мер да абароны рабкора ад ганеньня за самакрытыку, не скасавала сваечасова няправільнай пастановы райкому і вывадаў камісіі АКК, і толькі праз доўгі час па тых-жа матар'ялах прыняла пастанову, накіраваную супроць глушыцеляў самакрытыкі.

г) у справе аб ганеньні на рабкора Маркава (лесазавод „Колектыўная Праца"), АКК, хоць і ўзяла пад абарону рабкора, аднак прыняла нявыразную і нерашучую пастанову і ў далейшым не зацікавілася крымінальнай справай па хлусьлівым абвінавачаньні Маркава, якое насіла характар прасьледваньня за яго рабкораўскую дзейнасьць;

д) пры разглядзе пастановы Рэчыцкага РК у адносінах артыкулу тав. Смалякова ў „Полесской Правде" аб т. Фрэйдліне і недахопах у Рэчыцкай організацыі, Гомельская АКК належным чынам не рэагавала на недапушчальную пастаноўку райкомам пытаньня аб прыцягненьні да адказнасьці рэдакцыі „Полесской Правды" і на такое-ж недапушчальнае абгаварэньне і пастанову актыву фабрыкі „Дняпро" па гэтым-жа пытаньні, якая пастанова была скасавана прэзыдыумам АКК у лістападзе месяцы 1929 году;

е) у справе члена партыі Гаўрылава АКК дапусьціла няправільны і супярэчлівы лёзунгу партыі аб самакрытыцы падыход, калі асноўным абвінавачаньнем супроць яго было высунута абвінавачаньне ў аўтарстве заметак, нібыта накіраваных да дыскрэдытацыі кіраўнікоў, якія ў сапраўднасьці выяўлялі недахопы райсаюзу. У асаблівасьці недапушчальным з боку АКК у гэтай справе зьяўляецца тое, што АКК ня толькі не дала адпору недапушчальным выступленьням у ячэйцы райсаюзу ў напрамку абмежавальнага разуменьня самакрытыкі, але ў супярэчнасьці з сапраўднымі фактамі—абвясьціла, што заметкі т. Гаўрылава не пацьвердзіліся;

ж) пры расьсьледваньні заметкі корэспондэнта „Полесской Правды" т. Заіка („Непостижимая логика") РСІ, пры высьненьні пастановы аб звальненьні яго з работы ў страхкасе, не расьсьледавала дакладна ўсёй гэтай справы і ў пастанове свёй дапусьціла рад няправільных формулёвак, якія не адпавядаюць прынцыпам самакрытыкі (патрабаваньне папярэдняй праверкі заметак, абвяшчэньне недапушчальным і самога факту зьмяшчэньня заметкі і г. д.);

з) у справе рабкора Дубава (гарбарня) АКК праводзіла няправільную лінію, якая выразілася ў няцвернай ацэнцы стану парт. проф. работы на заводзе, у недапушчальнай пастанове аб звальненьні беспартыйных рабочых з заводу, наданьні выступленьню Дубава на конфэрэнцыі саюзу характару політычнай дэкларацыі. АКК у гэтай справе ня ўлічыла і сапраўднай абстаноўкі на заводзе і сваёй няправільнай пастановай аб'ектыўна выклікала ўзмацненьне элемэнтаў заціску самакрытыкі і дала магчымасьць скарыстаньня звальненьня Дубава ў якасьці пагрозы за самакрытыку.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ мінуламу складу АКК у дырэктыўных паказаньнях ЦКК па радзе спраў (справы рабкораў Маластоўкера, Любіна) былі даны вычэрпальныя паказаньні аб рашучай барацьбе з парушэньнямі самакрытыкі і прызнаючы, што Гомельская АКК ня ўлічыла належным чынам дырэктывы ЦКК, дапусьціла рад новых памылак і праявіла слабасьць у барацьбе за самакрытыку, прэзыдыум ЦКК пастанаўляе:

1. Абвясьціць вымову прэзыдыуму АКК за дапушчаныя памылковыя пастановы, якія сьведчаць аб нерашучасьці АКК у барацьбе з парушэньнямі лёзунгу партыі аб самакрытыцы.

2. З прычыны таго, што сакратар АКК тав. Клімэнка ў радзе спраў і ў асаблівасьці ў справе сьпіртазаводу, членам ячэйкі якога ён зьяўляўся, праявіў нездольнасьць да правільнага орыентаваньня ў пытаньнях самакрытыкі,—прапанаваць АКК абгаварыць пытаньне аб магчымасьці далейшай работы т. Клімэнка ў якасьці сэкратара і члена прэзыдыуму АКК.

3. Зацьвердзіць заключэньне камісіі ЦКК па справах—т. т. Гаўрылава, Маркава, Заікі, Дубава і членаў ячэйкі сьпіртазаводу—Вясёлава, Качаноўскага і Фрыдляндэра.

4. Прыняць да ведама пастанову Гомельскіх АК і АКК па справе аб заціску самакрытыкі ў Залінейнай і Рэчыцкай організацыях.

5. Пастанову апублікаваць у друку.

Асобна: Прызнаць, што пры разглядзе справы Гаўрылава члены ЦКК т. т. Гілякевіч, Юргенсон і Валынец не ўстанавілі памылковасьці пастановы АКК і гэтым затрымалі сваячасовае рэагаваньне ЦКК на памылку Гомельскай АКК.

Лісток „лёгкай кавалерыі“

У дапамогу Раб.-Сял. Інспэкцыі

Некаторыя атрады праходзяць міма важных палітычных спраў. Зрабіць рашучы паварот „кавалерыйскага“ агню на шкоднікаў і здраднікаў, на тых, хто перашкаджае ажыцьцяўленьню задач партыі, соцыялістычнага будаўніцтва, ліквідацыі кулацтва, як клясы

МОБІЛІЗАВАЦЬ „КАВАЛЕРЫСТЫХ“ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРОМФІНПЛЯНАЎ, ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЯСНОВАЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КАМПАНІІ І ТРОХМЕСЯЧНІКУ ПРОЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Баявыя атрады не на баявым месцы

У Нова-Беліцы (Гомельшчына) у палове студзеня праходзіў зьлёт „Лёгкай Кавалерыі“. На зьлёт зьявілася 80 „кавалерыстых“ і столькі-ж гасьцей. Трэба сказаць, што зьлёт праваліўся. На зьлёт не зьявіліся профпрацаўнікі і гаспадарнікі ад самых буйных прадпрыемстваў раёну, як ф-ка „Вэзуві“ і „Культруд“. Падрыхтоўчая работа да зьлёту была правалена, гэта адзначыў і сам зьлёт. Пасьля зьлёту меркавалася наладзіць політ-суд над бюрократамі, але гэта ня было зроблена з-за непадрыхтоўкі. Райком ЛКСМБ замест кіраўніцтва штабам „ЛК“ вынес яму вымову і гэтым абмежаваўся. Пытаньне аб працы штабу на РК не разглядалася. Уся работа зьлёту была праведзена за адзін вечар, гэта прывяло да таго, што зьлёт, які іменаваўся вопытна-паказальным, сябе не апраўдаў. Таму акругком ЛКСМБ, разглядаючы пытаньне аб зьлёце, адзначыў, што зьлёт быў сарваны, політычнае значэньне яго было затушавана. Зьлёт адменены і намечана правесьці яго ў другі раз.

У рабоце груп „Лёгкай Кавалерыі“ маецца шэраг адмоўных зьявішч, якія павінен будзе выкрыць надыходзячы зьлёт. Групы „ЛК“ у большасьці працавалі налётамі, мала займаліся сыстэматычным штодзённым выкрыцьцём недахопаў. Некаторыя кавалерыстыя недастаткова ўразумелі сутнасьць „Лёгкай Кавалерыі“. Характэрна, што некаторыя ўступалі ў „Лёгкую Кавалерыю“ з мэтай атрыманьня аружжа і задавалі пытаньне: „ці атрымаю я наган?“

У раёне ўсяго 190 „кавалерыстых“, дарослых рабочых у „кавалерыі“ можна пералічыць па пальцах, напрыклад, на ф-цы „Вэзуві“ налічваецца каля 2000 рабочых, з іх моладзі 400 чал., а „кавалерыстых“—60 чал. На лесазаводзе „Комтруд“ налічваецца 340 рабочых, з іх моладзі—130, а „кавалерыстых“—18.

Да апошняга часу „кавалерыстыя“ надта мала займаліся пытаньнем сваёй вытворчасьці. Шэраг дробных пытаньняў, якія можна было вырашыць на месцы, „кавалерыстыя“ несьлі ў РСІ, загружалі яе, таму здаралася, што не атрымлівалі своечасовых адказаў. Адсутнасьць добрага кіраўніцтва спрыяла недахопам у рабоце „Лёгкай Кавалерыі“.

Група „ЛК“ заводу „Комтруд“ выкрыла моманты безгаспадарнасьці пры пабудове вузка-калейкі, на якую затрачана больш сродкаў, чым было намечана. Бюро партколектыву марынавала матар'ял. Тры разы гэта пытаньне разьбіралася на бюро. На заводзе працьвітае зажым самакрытыкі, бюрократызм і безгаспадарчасьць.

На фабрыцы „Вэзуві“ маюцца факты шкодніцтва, а „Лёгкая Кавалерыя“ стаіць у баку, нібы яе гэта ня тычыцца. На фанэрным заводзе было імкненьне ўзарваць прэс. Ва ўпаковачным цэху наладжваюцца п'янкі ў час работы і г. д., але „Лёгкая Кавалерыя“ для зьнішчэньня гэтага таксама ня прыняла рашучых мер.

На лесазаводзе „Комтруд“ вытворчасьць працы замест 25 проц. павысілася ўсяго на 11 проц. На фабрыцы „Вэзуві“ програма першага кварталу невыканана па сярнічках на 10 проц., па фанэры на 20 проц.; прапановы рабочых ня выконваюцца, з 44 прапаноў праведзена ў жыцьцё толькі 18, а астатнія марынуюцца.

У магазыны ЦРК пралез чужы элемэнт, адчуваецца зажым самакрытыкі. „Лёгкая Кавалерыя“ выявіла гэта, але праўленьне ЦРК пакуль маўчыць. Вось на такія факты „Лёгкая Кавалерыя“ павінна зварочваць больш увагі. Трэба праяўляць больш настойлівасьці і ўпартасьці, каб даводзіць справы да канца, і наносіць руйнуючы ўдар па шкодніках нашага будаўніцтва.

МІХАСЬ УТКІН.

Так часам працуюць „кавалерысты“



У часе „налётаў“ — І ў часе „будняў“

ПІОНЭРЫ—„КАВАЛЕРЫСТЫЯ“

Пры барысаўскім райкоме ЛКСМБ маецца піонэрская група «лёгкай кавалерыі». Гэта група зрабіла налёт на гарсавет і выявіла, што пункты піонэрскага наказу выкананы ня ўсе. Не пабудаваны піонэрскі клюб у Нова-Барысаве, няма дзіцячых дактароў пры заводзкіх амбуляторыях.

Піонэры — «кавалерыстыя» зрабілі налёт на брыгаду па вярбоўцы комсамольцаў на піонэрработу і гэтым самым зрабілі нямалую справу.

Трэба сказаць, што „лёгкая кавалерыя“ сярод піонэраў яшчэ ня мае належнага пашырэньня і на гэта неабходна зьвярнуць больш увагі.

З.

„ГЭТА САКРЭТ“

На станцыі Буда-Кашалеўская (Гомельшчына) група „лёгкай кавалерыі“ організавалася ў 1928 г. З першых дзён сваёй працы група пачала выкрываць злоўжываньні на прадпрыемствах і організацыях. Былі выкрыты злачынствы ў лясьніцтве.

У час чысткі сав. апарату „кавалерыстыя“ дапамаглі ўдарным брыгадам правяраць працу ўстаноў.

Маецца шэраг адмоўных зьявішч у працы групы. У хлебазагатоўках група нічога не зрабіла. Праца праводзілася конспэратыўна, комсамольскія масы аб працы групы ня ведалі, даклады аб працы „ЛК“ на сходах ня ставіліся і калі хто спрабаваў на сходзе гаварыць аб групе, дык старшыня групы адказваў: „Гэта сакрэт, як мы працуем, мы толькі даем справаздачу РК ЛКСМБ і КП(б)Б“.

Вас. Цімохаў.

Бюйныя промахі

На зьлёце „ЛК“ Прапойскага раёну (Магілеўшчына) выяўлены цікавыя факты, з працы „ЛК“ як адмоўныя, таксама і дадатныя. Напрыклад, адна група „ЛК“ зрабіла налёт на суд і знайшла там шмат недахопаў. У выніку зьнялі судзьдзю.

Але разам з гэтым трэба адзначыць, што ў працы атрадаў ёсьць буйныя промахі. Кавалерыстыя зусім мала займаліся пытаньнямі колектывізацыі, ільнозагатовак і г. д. Былі выпадкі, калі „кавалерыстыя“ у час чысткі савецкага апарату выступалі і абаранялі пазбаўленцаў. Такія выпадкі ня могуць быць цярпімы ў рабоце „Лёгкай кавалерыі“.

У спрэчках на зьлёце выступіла ... чалавек. Зьлёт пастанавіў выклікаць на соцыялістычнае спаборніцтва кармянскую, чырвонакольскую і журавіцкую групы „лёгкай кавалерыі“.

СТЭРЛІН.

Патрэбна „кавалерыйскае“ вока

Група „лёгкай кавалерыі“ Ляшвянскай ячэйкі ЛКСМБ (Меншчына) развалілася. На абшарах сельсавету ваглядаецца шмат адмоўных зьявішчаў, якія не заўсёды выкрываюцца. Напрыклад, у рабоце коопэрацыі былі выпадкі скрыўленьня клясавай лініі: крамнік Каленчыц Янка прадаў пазбаўленцу 17 пудоў шыннага жалеза; па суседзтву з сельсаветам жыве дзяк, і старшыня з ім у добрых адносінах. Дзяк лічыцца „бедняком“ і яму зьнялі падатак. Старшыня сельсавету выдаў няправільную даведку Карпіловічу Алесю для паступленьня ў вышэйшую навучальную ўстанову, але дзякуючы комсамольскай ячэйцы гэта выявілася.

У справе колектывізацыі сельсаветам працы не праводзіцца, у камітэце ўзаемадапамогі сяброўскія ўзносы ня ўсе спагнаны.

Я. Карпаў.

ВЫЯВІЛІ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

Сельска-гаспадарчая сэкцыя сьмілавіцкага райзьлёту „ЛК“ (Меншчына) зрабіла налёт на Корзанаўскі сельсавет і выявіла, што адна трэцяя частка сяброў сельсавету ня прымаюць удзелу ў колектывізацыі. Больш таго, некаторыя з іх выступаюць супроць колектывізацыі. Такое становішча наглядалася ў вёсцы Дукорчына.

Некаторыя сябры сельсавету ўцякаюць з сходаў па колектывізацыі. Напрыклад, у вёсцы Падгор'е Мукамончык Вінцэсь.

Сэкратар сельсавету спачатку таксама выступаў супроць колектывізацыі, але потым увайшоў у колгас, ды без сям'і.

Колектывізацыя праходзіць самацёкам, колгасы яшчэ не аформлены. Сельсавет ня прымае ніякіх захадаў супроць разбазарваньня маемасьці і жывёлы. Падрыхтоўка да вясновай пасеўкампаніі вядзецца кепска. Збор самаабкладаньня да гэтага часу яшчэ ня выкананы. Ёсьць кулакі, якія не заплацілі самаабкладаньня. Па збору падатку і страхоўкі сельсавет у раёне займае апошняе месца.

Заданьне па 3-й пазыцы індустрыялізацыі поўнасьцю ня выканана.

РЫГОР П.

Заданьні на час адпачынку

У ачышчэньні навучальных устаноў ад чуждых элемэнтаў вялікую ролю павінны адыграць атрады „Лёгкай Кавалерыі“. У гэтай справе можна выкарыстаць вопыт атраду „ЛК“ Марына-Горскага тэхнікуму. Перад ад'ездам на канікулы кожны кавалерыст атрымаў конкрэтнае заданьне, каб выкарыстаць свой адпачынак для выяўленьня чуждых элемэнтаў у навучальных установах. І гэта, зразумела, акажа нямалую дапамогу для ачысткі навучальных устаноў.

КІППЭР.

На вачох „кавалерыі“ але...

У рэчыцкіх сельска-гаспадарчых майстэрнях (Гомельшчына) адміністрацыя купіла стругальны станок за 200 рублёў. Станок быў няспраўны. Яго аддалі адрамантаваць аднаму рвачу і п'яніцы, які узяў за рамонт 230 рублёў. Правазіўся з рамонтам некалькі месяцаў. І ў выніку нічога ня вышла. Вылучаная камісія для прыёму станка прызнала, што ён адрамантаваны кепска і да работы ня прыгодзен. Не гледзячы на тое, што гэта ўсё адбывалася на вачох „лёгкай кавалерыі“, справа ўсё-ж была замазана.

У пякарні ЦРК выкрыта шкодніцтва, дзе было спалена каля 4000 пудоў хлеба, але „лёгкая кавалерыя“ нічога ня прадпрыняла. „Кавалерыстыя“ любяць наладжваць налёты на другія прадпрыёмствы, а на сваім прадпрыёмстве не глядзяць.

Трэба сказаць, што „кавалерыстыя“ прамаргалі такія важныя мерапрыёмствы, як чыстку партыі, чыстку савапарату, чыстку саматужных арцеляў, прымаючы ў гэтым вельмі слабы ўдзел.

М. Р.

Усім „лёгкім кавалерыстым“— дэлегатам усебеларускага зьлёту „ЛК“

Надаючы вялікае значэньне справе організацыі абмену вопытам, збору матар'ялаў аб рабоце асобных груп „ЛК“, штаб па правядзеньню усебеларускага зьлёту „ЛК“ зварочваецца да вас з просьбаю падрыхтаваць матар'ялы аб рабоце сваёй групы. Пажадана, каб дэлегаты ў сваіх справаздачах спыніліся на наступных пытаньнях:

Як праводзілася работа па азнаямленьню комсамольцаў з рашэньнямі партыі і комсамолу аб барацьбе з бюрократызмам і задачамі „ЛК“ (даклады, вечары пытаньняў і адказаў, прапрацоўка ў гуртках, скарыстаньне друку).

Што ўжыта для прыцягненьня беспартыйнай моладзі і дарослых рабочых да работы груп „ЛК“.

Ці працавала група толькі па заданьнях РСІ, або праводзіла мерапрыёмствы і па сваёй ініцыятыве. Як была разгорнута самадзейнасьць саміх кавалерыстых. Ці зварочваліся беспартыйныя непасрэдна да вас з матар'ядамі.

Што конкрэтна праароблена групай па падвышэньню вытворчасьці, па барацьбе з бюрократызмам, па колектывізацыі сельскай гаспадаркі, па разгортваньні соцспаборніцтва і г. д.

Якія адносіны грамадзкіх організацый (профсаюзных, коопэрацыйных і іншых) да груп «ЛК». Наколькі рэалізуюцца пастановы «ЛК» і як інформуецца група аб выніках рэалізацыі сваіх пастаноў.

Ці былі моманты ігнараваньня і прасьледваньня „кавалерыстых“.

Якая сувязь з насьценнымі газэтамі «Чырвонай Зьмены», ці зьмяшчаеце вы матар'ялы ў газэтах.

Ці займалася група пытаньнямі праверкі становішча тых ці іншых галін комсамольскай работы і што ў гэтых адносінах праведзена.

Якая сувязь з бюро ячэйкі і райштабам, як яны кіруюць работай вашай групы.

Ці праводзіўся абмен вопытам з іншымі групамі «ЛК», ці прапрацоўвалі літаратуру у прыватнасьці кніжку Кінжалава аб задачах, мэтадах і формах работы «ЛК».

Матар'ялы павінны здавацца ў ЦК ЛКСМБ пры атрыманьні мандатаў на усебеларускі зьлёт „ЛК“.

Штаб па правядзеньні усебеларускага зьлёту „ЛК“.

ЯК БЫЎ ОРГАНІЗОВАН НАЛЁТ

Група „Лёгкай Кавалерыі“ заводу „Кожа“ (Жлобін) у сьнежні месяцы рашыла організаваць налёт. „Кавалерыстыя“ падзяліліся на групы. Першая група пашла праверыць зерняныя склады па Жлобіну. Перш. чым пачаць працу, „кавалерыстыя“ дагаварыліся з агрономам і даведаліся, якімі павінны быць склады для ссыпкі зярна. Налётам было выяўлена, што памяшканьне складу Хлебсаюзу № 1, дзе знаходзіцца каля 20 тыс. пуд. зярна, як сьлед не падрыхтавана, сьцены трэ' было абабіць фанэрай каб не псавалася зярно, але гэтага ня зроблена. У памяшканьні, дзе знаходзяцца ячмень і авёс, недастаткова паветра і г. д.

Другая група зрабіла налёт на спажывецкае таварыства, дзе выявіла, што нарзан, якога тут складзена ня 1800 рублёў, знаходзіцца ў сьцюдзёных памяшканьнях і пры марозе з бутэлек выціскаюцца коркі. Коопэратары ня прымаюць рашучых мер, каб папярэдзіць вялія страты.

Трэцяя група наладзіла налёт на піўныя райдзеткамісіі і выявіла шэраг адмоўных зьявішчаў,—матар'ял перадала ў РСІ.

Чацьвертая група зрабіла налёт на саматужную арцель „Чырвоны Кастрычнік“ з мэтай праверкі, ці не бяруць члены арцелі работы на дом. І выявіла, што некаторыя з іх так і рабілі. Праўленьне арцелі пасьля гэтага прыняло адпаведныя меры.

Пасьля налёту „кавалерыстыя“ сабраліся і агульна абмеркавалі яго вынікі.

ГРУПА „ЛК“.

На акруговай конфэрэнцыі колгасьнікаў Меншчыны

Паскорым тэмп суцэльнай колектывізацыі Менскай акругі

Заканчваецца суцэльная колектывізацыя Копыльскага і Сьмілавіцкага раёнаў

У КОПЫЛЬСКІМ РАЁНЕ З 350 КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК—РАСКУЛАЧАНА 300

Тав. Славінскі ў сваім дакладзе адзначыў, што конфэрэнцыя сабралася ў час шпаркага разгортваньня масавай колектывізацыі амаль ва ўсіх раёнах Менскай акругі і ў час, калі комуністычная партыя паставіла задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Жыцьцё перашагнула ўсе пляновыя меркаваньні, якія былі вызначаны па колектывізацыі ў акрузе.

У гэтым годзе нашыя заводы выпусьцяць 41 тысячу трактараў, але гэтыя трактары ня змогуць забясьпечыць нашы патрэбы. Таму перад намі стаіць задача абагуліць усе сродкі вытворчасьці, жывёлу з тым, каб вясну сустрэць падрыхтаванымі. Той, хто думае, што ўступаючы ў колгас, ён адразу перасядзе на трактар, **глыбока памыляецца.**

У бліжэйшыя гады прыдзецца нам яшчэ працаваць з тымі сродкамі вытворчасьці, якія ў нас маюцца.

Па дакладу тав. **Славінскага** аб задачах колектывізацыі сельскай гаспадаркі разгарнуліся жывыя спрэчкі, з запісаўшыхся 61 чалавек выказалася—24.

Тав. **Бабчынскі** (Копыльскі раён) расказвае аб тым, што Копыльскі раён, які вызначан да суцэльнай колектывізацыі, на сёньняшні дзень колектывізаваны больш як на 80 проц. Батракі, беднякі і серадзякі з вялікім уздымам сустрэлі пастанову партыі аб ліквідацыі кулака, як клясы. Мы конкрэтна прыступілі да гэтай работы. З 350 кулацкіх гаспадарак, якія маюцца ў раёне, 300 ужо раскулачаны. Вялікую дапамогу ў рабоце па колектывізацыі, а таксама па раскулачваньню аказалі нам рабочыя брыгады.

Але на гэтым мы не затрымліваемся, мы прыступілі да абагульваньня жывёлы, насеньня. Гэтай вясною ў нас на палёх будзе працаваць машынна-трактарная станцыя.

Т. т. **Гантман** (колгас „Прогрэс" Сьмілавіцкага раёну) і **Галадушка** (комуна „Комсамолец", Астрашыцка-Гарадзецкага раёну) завастраюць увагу конфэрэнцыі на тых буйных палітычных памылках, якія былі зроблены органамі БелАзэту ў справе надзяленьня зямлёй. Замест працоўнай яўрэйскай бедната ў колгасы часьцяком пападалі пазбаўленцы, сіоністыя і наогул чужакі, якія сваёй работай у колгасах падрывалі ў вачох сялянства ідэі колектывізацыі. Т.т. Гантман і Галадушко прапануюцьператварыць нацыянальныя колгасы ў інтэрнацыянальныя.

Тав. **Навіцкі**—(Бягомльскі раён)—калі ў 1928 годзе ў нашым раёне налічвалася 9 колгасаў, якія займалі 2 проц. ўсёй пасяўной плошчы раёну, дык на сёнешні дзень мы маем 40 колгасаў, на плошчы 45—50 проц. усёй пасяўной плошчы. Кулацтва, клерыкалы і антысавецкія элемэнты супраціўляюцца шпаркаму тэмпу колектывізацыі, але атрымліваюць рашучы адпор.

Марыя Хадасевіч — (Колгас „Чырвоная Зьмена", Зембінскага раёну). Ёй больш як 60 гадоў, але яна з радасьцю апавядае аб нячуваных тэмпах перабудовы вёскі на соцыялістычны лад

— У дзень 6-годзьдзя сьмерці У. І. Леніна—кажа тав. Хадасевіч:—я ўступіла ў шэрагі комуністычнай партыі. На Барысаўскай конфэрэнцыі колгасьнікаў (якая скончыла нядаўна сваю працу) у фонд колектывізацыі сельскай гаспадаркі я здала залаты пярсьцёнак і заклікаю ўсіх колгасьніц ў першую чаргу дэлегатак, здаць усе свае залатыя рэчы ў фонд індустрыялізацыі.

Выступаюць цэлы шэраг таварышоў, якія ілюструюць рост колгаснага руху, прыводзяць факты кулацкага супраціўленьня.

Дэлегаты старых колгасаў дзяліліся вопытам работы ў сваіх колгасах.

— На ранішнім паседжаньні 2-га студзеня конфэрэнцыю віталі прадстаўнікі з польскай конфэрэнцыі працоўных палякаў г. Барысаву і Менску.

Ударыць па руках зажымшчыкаў самакрытыкі

У Менскай канторы Савгандальфлёту працьвітае п'янка і склокі. Натхніцелямі гэтай справы зьяўюцца т.т. Прэсман і Белазоўскі. У лістападзе месяцы мінулага году меў месца выпадак, калі камсамольцу тав. Вульфсону, які тэм працуе, было паведамлена рабочымі аб тым, што ўся верхавіна канторы на чале з сэкратаром парт'ячэйкі, сыстэматычна наладжваюць п'янкі. Вульфсон рашыў праверыць заявы рабочых, аб чым ён своечасова паведаміў некаторых сяброў партыі з гэтай-жа ячэйкі.

Аднойчы, ідучы вечарам разам з т.т. Прэсманам, Белазоўскім, Рабчынскім і Кацам, пачалі гаварыць аб выпіўцы, але ні ў каго не аказалася грошай. Тады тав. Вульфсон запазычыў ім 10 рублёў, якую суму яны сумесна прапілі. Пасьля гэтага выпадку тав. Вульфсон падаў заяву ў райком КП(б)Б і КСМБ аб бясчынствах, якія творацца ў канторы Савгандальфлёту.

Характэрна адзначыць, што да гэтага выпадку тав. Вульфсон будучы ў ячэйцы Аўтатранспарту лічыўся адным з лепшых і актыўнейшых сяброў КСМ. Ён быў рэкамандаваны бюро ячэйкі КСМ у кандыдаты партыі.

Райком ЛКСМБ вылучыў камісію для праверкі працы ячэйкі, паколькі ў гэтай п'яніцы быў замешан і сакратар ячэйкі ЛКСМБ тав. Рабчынскі.

Тут-та і пачынаецца фактычны зажым самакрытыкі і моманты выжыцьця комсамольца Вульфсона. У камісію РК пішуць заяву т.т. Прэсман і Кац аб тым, што Вульфсон, паступаючы ў ЛКСМ, захаваў сваё соцыяльнае паходжаньне,—бацька яго, які быццам-бы трымаў прытон. Сам ён падхалім склочнік і з учарашняга добрага комсамольца ён на сёньняшні дзень стаў самым горшым. Бюро РК ЛКСМБ пры разглядзе вынікаў камісіі ня лічыла патрэбным выклікаць Вульфсона і завочна выключаюць яго з шэрагаў КСМ. Канфліктная камісія АК ЛКСМБ, куды Вульфсон зьвярнуўся з апэляцыяй, разгледзеўшы ўвесь матар'ял, пастанавіла: „Аднавіць яго ў шэрагах КСМ і вынесьць яму суровую вымову з папярэджаньнем за падбухторваньне сябра партыі на п'янку".

Лічым, што ў адносінах выпіўкі ня можа быць ніякага падбухторваньня. Тав. Вульфсон хацеў выкрыць хваравітасьць, якая мелася ў канторы. А кампанія, якую выкрываў т. Вульфсон, стараецца выжыць яго з працы і праводзіць гэта ўсялякімі мэтадамі ў прыватнасьці для гэтай мэты тав. Белазоўск будучы старшын ёй профкому піша допіс у часопіс „Красный Транспортнік" за № 2, пад загалоўкам: „Склочнікі і падхалімы". Потым, калі Вульфсон прызываецца ў Чырвоную Армію і пападае ў пераменны склад, ён пасьля РСЧА на працу не дапускаецца. Прычым даюцца такія матывы, што „на яго месцы ёсьць іншы". Мы лічым, што ў ячэйцы зажым самакрытыкі. Звальненьне з работы падцьвярджае факт ганеньня на комсамольца, які хацеў выкрыць маючыяся балячкі ў канторы.

Ведаючыя

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ПРОФШКОЛ

ЦК ЛКСМБ пастанавіў склікаць 25 лютага г. г. усебеларускую конфэрэнцыю профшкол, на якой будуць пастаўлены наступныя пытаньні:

Чарговыя задачы профтэхасьветы ў сувязі з індустрыялізацыяй краіны і колектывізацыяй сельскай гаспадаркі, месцы профтэхасьветы ў сыстэме нарасьветы, соцспаборніцтва. самакіраваньне ў профтэхшколах і інш.

Напярэдадні ўсебеларускай конфэрэнцыі ЦК ЛКСМБ пастанавіў лічыць неабходным праводзіць раённыя конфэрэнцыі профшкол.

Пасылка комсамольцаў на будаўнічыя работы

У мэтах забясьпечаньня будаўніцтва адпаведна клясава сьвядомымі рабочымі, якія-б садзейнічалі ўзьняцьцю на належную вышыню якасьці будаўніцтва, былі-б ініцыятарамі і праваднікамі соцспаборніцтва, сэкратарыят ЦК ЛКСМБ пастанавіў мобілізаваць 100 чал. актыўных комсамольцаў з ліку чорнарабочых, якія заняты ў прамысловасьці, на будаўнічую работу.

У лік 100 чал. будуць набірацца лепшыя актыўныя комсамольцы, якія сябе выявілі на актыўнай комсамольскай і вытворчай рабоце. Мобілізаваныя таварышы пройдуць праз будаўнічыя курсы.

Вызначаная колькасьць разьмеркавана па акругах наступным чынам: Менская, Гомельская і Віцебская—па 20 чал., Аршанская—15 чалавек, Бабруйская і Магілеўская—па 10 чал., Мазырская і Полацкая—па 5 чалавек.

Мобілізацыя таварышоў павінна быць закончана НЕ ПАЗЬНЕЙ 5 ЛЮТАГА

Аднача сова сэкратарыят ЦК ЛКСМБ пастанавіў з мэтай павялічэньня комсамольскага ядра сярод будаўнічых рабочых, лічыць неабходным паслаць на будаўнічыя курсы яшчэ 1000 чалавек з ліку гарадзкіх беспрацоўных і батракоў.

Месцы разьмяркоўваюцца наступным чынам: Менская, Гомельская і Віцебская акругі пасылаюць па 200 чал., Магілеўская і Аршанская—па 100 чал., Бабруйская—150 чал., Полацкая і Мазырская—па 50 чал.

Пасылка таварышоў на будаўнічыя курсы павінна быць закончана НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 ЛЮТАГА.

Пры адборы на курсы трэба мець на ўвазе пасылку дзяўчат

Зрываюць дадатковы набор

У Гомельскай школе ФЗВ чыгуначнікаў справа з дадатковым наборам абстаіць ня добра. Два месяцы таму назад на школьным савеце было вырашана, што без асобых затрат можна прыняць дадаткова 105 чалавек. Пастанова была ў той-жа дзень адаслана ў гор. Калугу ў аддзел Асьветы Заходніх чыгунак.

На днях загадчык школай атрымаў паперу з рэзолюцыяй, у якой прапануецца: **прыслаць зьвесткі колькі можа школа прыняць дадаткова вучняў.** З боку аддзелу асьветы заходніх чыгунак назіраецца бюракратычны падход да справы дадатковага набору вучняў у школы ФЗВ.

Цішка Верны.

Мен. АК ЛКСМБ сумесна з Фрунз. і Кастрыч. РК склікае нараду эканомпрацаўнікоў і лёгкіх кавалерыстых г. Менску на 5-II у памяшканьні АК роўна а 6-й гадз. увечары.

Парадак дня: 1. Аб удзеле і выкананьні моладзьдзю промфінпляну на 1-шы квартар бягучага году.

Усе эканомпрацаўнікі і ЛК у абавязковым парадку павінны зьявіцца ў памяшканьне АК.

АК ЛКСМБ.

СПАБОРНІЦТВА НАВЫВАРАТ

Ячэйка і вучком Гомельскай школы ФЗВ чыгуначнік[аў] ускл алі кіраўніцтва соцспаборніцтвам на особа вылучан[ы] камітэт садзейнічаньня спаборніцтву—„КОМСОД".

Калі задаць пытаньне, што зроблена, дык адказ буд[зе] прыблізна такі:

„У нас ёсьць камітэт, гэта—грозная організацыя, яка[я] абвясьціла сьмяротны бой прагульшчыкам, гультаям і ін[]шым шкоднікам вытворчасьці. Доказам гэтага можа слу[]



„КОМСОД" ЗА ПРАЦАЙ

жыць ганебная дошка, на якой красуюцца некалькі вядо[]мых вучняў. Яшчэ ў камітэце ёсьць папка, а ў гэтай пап[]цы многа дагавароў: дагавор са Жлобінскай школай ФЗВ[,] Сасноўскай дагавор першай кацельнай з другой, дагаво[р] першага сталярнага цэху з другім і т. д... Потым, у гэта[й] папцы ёсьць яшчэ шмат пратаколаў.

— Ну, дык што-ж зроблена рэальна?

— Нічога.

Ціхон Палынь.

Паштовая скрынка

Ромб Кім'у—„У віры жыцьця". **Вынаходку**—„Комсамолец абараняе інтарэсы кулака", **Курганскаму Я.** — „Хто я", **Максімовічу** — „Хлусьня пераможа, але чыстым застаюся", **Пятрушыну П.**—„Вось дык комсамольцы", **Кавалеву Я.**—„Зарапартаваўся комсамолец", **Арлову**—„Аздаравіць Дабранскую ячэйку ЛКСМ", **Асоту** — „Дае прыклад сэкратар", **Комсамольцу**—„Замест працы, папойка", **Паляку**—„Выключыць з комсамолу Кучынскую", **Казлову**—„Ліст у „Чырвоную Зьмену", **Зільбэрману**—„Сэкратар валакітчык", **Калючаму**—„Славуты чалавек", **Ш-Ше**—„Райком падрывае зімовую вучобу",—усе гэтыя допісы накіраваны ў адпаведныя органы для расьсьледваньня і прыняцьця мер.

Воцату—„Трэба вырашыць"—допіс накіраваны ў ЦК ЛКСМБ на вырашэньне.

Сеўруку—„Паведамленьня", **Невяроўскаму**—„Аб хаце чытальні", **Каплану**—„Аб адным абрашчэньні", **Цьвяткоў**—„Часьцей бачыць такіх гасьцей", **Комсамольцу**—„Організуйце моладзь", **Нахімовічу А.** — „Ліст у рэдакцыю", **Палыну**—„Недастоін назвы комсамольца", **Пухавіцкаму**—„Аб комсамольскай ячэйцы ЦРК", **Г. Ф.**—„Працуем па старому", „Бюро ячэйкі не зьвяртае ўвагі", „Няма ніякага кіраўніцтва", **Комсамольцу** — „Ячэйка сьпіць", **Бубянку**—„Аб адным комсамольцы", **Міхасю Агонь**—„Палітвучоба адсутнічае", **Грыню А**—„Час за працу", **Жыгальскаму**—„Вызываем на соцыялістычнае спаборніцтва", **Гэгеру** — „Працоўная інтэлігенцыя у нагу з рабочымі і г д.", Рэзолюцыя комсамольскай ячэйкі курсаў актыву і другой роты АБВШ, аўтарам заметак -„Грош цана такім..." і „Дрэнная справа з працай ячэйкі",—усе гэтыя допісы друкавацца ня будуць, некаторыя з іх напісаны агульна, а частку можна скарыстаць для насьценнай газэты ці пытаньні, закранутыя ў заметцы, вырашыць месцы.

Б. Цыпіну—„Аб клясавай бараць[бе] на ідэолёгічным фронце і Б. Д. Бі[]отэцы"—аб гэтым некалькі дзён т[аму] назад рэдакцыя пісала, ахарактарыз[оў]ваючы становішча ў БДБ больш яс[ней], чымся ты,—ня пойдзе.

Комсамольскі КАЛЕНДАР

ПА ПІАНЭРСКАЙ ОРГАНІЗАЦ[ЫІ] ФРУНЗЭЎСКАГА РАЁНУ

Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары[,] памяшканьні Цэнтральнага піон[эр]скага клюбу (Савецкая вулі[ца]) склікаецца пазачарговы піонэр[скі] актыў Фрунзэўскага раёну.

Павінны зьявіцца: старшыні са[]ветаў фарпостаў, старшыні вуч[ко]маў, групы „Легкай Кавалер[ыі]" школ і атрадаў, старшыні савет[аў] атрадаў і важатыя зьвень[яў] Фрунзэўскага раёну.

Адказнасьць за яўку ўсклада[ец]ца на павадыроў фарпостаў і [ат]радаў. **ФРУНЗЭУСКІ РБДК[А]**

4 лютага ў чытальні Дому К[ом]самолу адбудзецца сход запісаўшы[х]ся ў сымфанічны оркестр пры Бел. Тра[]

Пачатак а 7 г. увечары.

5-га лютага 1930 году, а 7-ай г[адз.] ўвечары ў Кастрычнікаўскім РК [] будзецца нарада піонэрскіх бры[гад,] якія езьдзілі ў колгасы.

Яўка абавязкова.

Сёньня ў памяшканьні Кастры[чні]каўскага Райкому, а 6-ай гад[зіне] ўвечары адбудзецца нарада важат[ых] зьвеньняў.

Яўка абавязкова. **РБ ЮП**

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Да ведама інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў Менску

Заўтра, 5-га лютага г.г., а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дом[у] Комсамолу (Комсамольская, 25) рэдакцыяй газэты „Чырвоная Зьмена" раз[ам] з МБІТ склікаецца нарада інжынэраў і тэхнікаў г. Менску па пытаньню ўдзел[у] ў тэхнічнай консультацыі пры газэце „Чырвоная Зьмена".

На нараду запрашаюцца т.т. Сульскі, Радаў (Мэталётрэст), Шлапакоў [] Вегер (завод „Энэргія"), Зуперман („Комунар"), Курман, Шэўчанка, Савіц[кі] Розэнфэльд, Шляпачнікаў, Маскалеўскі, Рыўкін, Ніоьневіч, Айзэнбэгг, Пінел[] Арляцоў, Эпштэйн, Івашоў, Розін (ВСНГБ), Рацкі, Галавінскі, Рабілаў (інсты[]тут прамысловасьці), Сульскі М. Н., Бромберг, Макрыцкі (Лесбел), Ёнг[] (скуртрэст), Цыперовіч (шклотрэст) Шэр (завод „Бальшавік"), Млоцін (пап[ер]трэст), Гузман, Гардон (Белжы саюз), Яноўскі, Адэльскі, Чэркоў (Белдзярж[]буд) Сухавораў (колгасцэнтр), Каржэнеўскі, Маскоў, Каманскі (Дзяржпла[н]) Добкін, Марголін (Эльвод), Шапіро, Эпштэйн (Белбудтрэст), Валасецкі, Ляхо[]. Міхаленка, Шмерлін, Рашотнікаў (Наркамзем). Позьняк зав. „Чырвоная Зорка"[,] Маўшовіч, Абрамовіч (Харчтрэст), Любошыц (Белсавгастрэст). Кіпрыян[]. (Галоўвыстаўком), Сафуранкаў (Белпалеводсаюз), Рагацкі (Белпайтрэст). [] рокін, Александровіч, Жалінскі (НК Поштэль), Максіменка, Шэпель (чыгун[]) Віктараў (Белгорсож), профэсар Прылежаеў і Змачынскі (БДУ), акадэ[мік] Шпаталяў (БАН).

Апрача пералічаных таварышоў запрашаюцца ўсе спэцыялістыя горад[у] Менску, кіраўнікі ўдарных брыгад, і рацыяналізатарскіх груп на прадпры[ем]ствах.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" і Бел. МБІТ.

Менск, друкарня БДВ.
Галоўлітбел № 599